Дзяржаўная ўстанова культуры
"Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка
Асіповіцкага раёна"
*Цэнтральная раённая бібліятэка*

*Серыя «Героі Савецкага Саюза – вызваліцелі Асіповіцкага раёна»*

# У ПАМЯЦІ НАШАЙ ГЕРОІ ЖЫВЫЯ



## АБРОСІМАЎ Міхаіл Раманавіч

# АБРОСІМАЎ
# Міхаіл Раманавіч

(01.05.1924 – 30.06.1944)

## БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА



**Нарадзіўся на хутары Пакроўскі Іўнянскага раёна Белгародскай вобласці ў сям'і сялян.Скончыў 7 класаў Верхопенскай школы. У час вучобы паказваў добрыя вынікі на абласных спаборніцтвах па стральбе. Пасля школы працаваў ў калгасе.**

**Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Абросімаў яшчэ не дасягнуў прызыўнога ўзросту. У ваенкамаце яму было адмоўлена. Неўзабаве яго хутар быў акупаваны ворагам. Цэлы год з невялікім яму давялося граць ролю псіхічнахворага, разыгрываць перад паліцаямі сцэны эпілептычных канвульсій, каб не быць адпраўленым у фашысцкае рабства. У лютым 1943 года савецкія войскі вызвалілі хутар. Абросімаў імгненна "ачуняў" і добраахвотна быў залічаны ў запасны полк.**

**У сакавіку 1943 года Міхаіл Абросімаў упершыню надзеў ваенную форму.Некалькі месяцаў ён руплiва вывучаў ваенную справу, паспяхова авалодваў спецыяльнасцю тэлефаніста. У складзе 297-га зенітна-артылерыйскага палка на Браншчыне прыняў ён баявое хрышчэнне. Зенітчыкі засцерагалі свае войскі, сустракалі варожыя самалёты дакладным агнём, і не апошняй у тых баях была роля тэлефаніста Абросімава: ён забяспечваў камандзіра батарэі надзейнай сувяззю.**

**Ваяваў на цэнтральным і 1-м Беларускім франтах. Хутка за абразцовае выкананне абавязкаў пры адбіцці налётаў фашысцкай авіацыі быў узнагароджаны медалём "За адвагу".**

**Старшы тэлефаніст 4-й батарэі 297-га зенітна-артылерыйскага палка яфрэйтар М.Р.Абросімаў асабліва вызначыўся ў бai за горад Асіповічы.**

**Загінуў у баі, пахаваны ў брацкай магіле на чыгуначнай станцыі Верайцы Асіповіцкага раёна.**

**22 жніўня 1944 года Міхаілу Абросімаву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.**

**Навечна залічаны Прыказам Міністра абароны СССР ад 27 кастрычніка 1956 года ў спіс асабовага саставу вайсковай часці, у якой ён служыў. Яго імем названы вуліцы ў Асіповічах, у вёсцы Верайцы, сярэднія школы ў Верхавінскім раёне Белгародскай вобласці і школа №2 у Асіповічах.**

# ГІСТОРЫЯ ПОДЗВІГУ



24 чэрвеня 1944 года пачалася Беларуская наступальная аперацыя “Баграціён”.

У раёне Бабруйска савецкія войскі акружылі буйную варожую групоўку. А 28 чэрвеня Масква салютавала войскам 1-га Беларускага фронту, якія авалодалі Асіповічамі. Але за горад зноў разгарэліся баі з часцямі фашысцкай групоўкі, якія прарваліся з бабруйскага “катла”.На ўсходняй ускраіне горада, паміж мастамі шашэйнай і жалезнай дарог праз раку Сіняя, размясцілася 4-я батарэя 297-га гвардзейскага зенітна-артылерыйскага палка.

30 чэрвеня 1944 года каля 1500 гітлераўцаў, якія вырваліся з акружэння, выйшлі ў раёне чыгуначнага вузла Асіповічы Магілёўскай вобласці на зенітчыкаў 4-й батарэі, у якой служыў гвардыі яфрэйтар Абросімаў. Навісла пагроза захвата батарэі, бо наводчыкі не бачылі цэлі, бруствер акопа не даваў магчымасці весці агонь па праціўніку.

Бываюць ў баі такія хвіліны, калі адвага аднаго чалавека з’яўляецца магутным парывам к подзвігу для ўсіх астатніх. Менавіта так здарылася ў гэтым баі. У тую хвіліну, калі варожы ланцуг

навіс над рубяжом зенітчыкаў, Міхаіл падняўся з акопа і прызваў сваіх таварышаў ісці наперад.

Вораг адступіў, аставіўшы на полі бою 38 забітых, больш 70 салдатаў праціўніка былі ўзяты ў палон. У гэтай схватцы Міхаіл Абросімаў быў смяротна паранены.



ГЕРОЙ Советского Союза

Все графы заполнять полностью

48

НАГРАДНОЙ ЛИСТ

1. Фамилия, имя и отчество АБРОСИМОВ Михаил Романович

2. Звание Гвардии ефрейтор 3. Должность, часть Ст. телефонист 297 Гвардейского Зен.Арт.полка 5 Гв.Зен.Арт.Речицкой дивизии РГК

Представляется к присвоению звания " Герой Советского Союза"

4. Год рождения 1924 5. Национальность Русский 6. Партийность Член ВЛКСМ с 1943 г.

7. Участие в гражданской войне, последующих боевых действиях по защите СССР и отечественной войне (где, когда) Отечественная война с марта 1943 г. в составе: Центрального и 1-го Белорусского фронтов.

8. Имеет ли ранения и контузии в отечественной войне Убит в бою 30.6.44 года.

9. С какого времени в Красной Армии с марта 1943 года. 10. Каким РВК призван Ивнянским РВК, Курской области.

11. Чем ранее награжден (за какие отличия) Медаль "За боевые заслуги", приказ по 297 Гв.ЗенАП № 01/н от 11.1.44 г.

12.

I. Краткое, конкретное изложение личного боевого подвига или заслуг

Гвардии ефрейтор Абросимов М.Г. участвуя в бою 30 июня 1944 года, когда на ОП 4 батареи шла группа пехоты противника численностью до 300 человек проявил героизм и отвагу в неравной борьбе. Немцы психической атакой шли на ОП батареи. Пехота лежавшая впереди батареи не выдержала напора немцев и стала отходить. Тогда тов. Абросимов оценивая создавшуюся угрозу батареи, находясь впереди орудий с автоматом в руке поднялся и с возгласом "Гвардейцев ничто не возьмет, за Сталина, за Родину вперед", бросился на врага. Бойцы батареи и пехота ранее отходившая с возгласом "ура" бросились в атаку. Немцы не выдержали огня и натиска наших бойцов, изменили направление и были деморализованы. В неравном бою тов. Абросимов был сражен пулей немецкого офицера. Умирая на руках своих товарищей он сказал-"Гвардейцы вперед на врага". Огнем из автомата убил 7 немецких солдат, а всей группой убито 38 человек и взято в плен 72 солдата и офицера.

За стойкость, мужество и героизм достоин посмертно присвоения ему звания "Герой Советского Союза".

КОМАНДИР 297 ГВ ЗеАП
ГВАРДИИ ПОЛКОВНИК / ВОИНОВ /

Командир (начальник) (звание)

3. июля 1944 г.

# ЛІТАРАТУРА

Абросимов Михаил Романович - Герой Советского Союза // Их именами названы…– Мн.,1987. – С.19-20.

Абросимов М. Р. // Герои Советского Союза: Краткий биограф.словарь. В 2 т. Т. 1. – Мн.,1987.– С.21.

Абросимов М. Р. // Навечно в строю: очерки о Героях Сов. Союза. – М. : Воениздат, 1985. – Кн. 7. – С.240-249.

Абросимов М. Р. // Акалович, Н. М. Освобождение Белоруссии. Люди и подвиги / Н. М. акалович. – Мн., 1989. – С. 338-346.

Абросимов М. Р. // Навечно в сердце народном. – Мн.,1984. – С. 6.

Абросимов Михаил Романович / Электронный банк документов «Подвиг народа в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг. – Режим доступа :http://www.podvignaroda.mil.ru

Абросимов Михаил Романович : персональный сайт. Книга памяти [Электронный ресурс] – Курск. – Режим доступа :http://geroykursk.narod.ru/index/0-669

Абросимов Михаил Романович : сайт ГУО“СШ №2 г.Асіповічы”. – Осиповичи. – Режим доступа : http://www.sch2osip.narod.ru/abrosimov1.htm

Зорын, У.П. Подзвіг сувязіста / У.П.Зорын // Запаветы Леніна. – 1989. – 27 чэрвеня. – С.2.